# Мірны Атам

Спецвыпуск

ЛАКАЛЬНАЯ ЗЯЛЁНАЯ ГАЗЕТА

№18 МІНСК, снежань 2009 г. http://mirnyatom.net


## ОТ РЕДАКЦИИ:

Этот номер издания «Мірны Атам» посвящен климатическому саммиту в Копенгагене (декабрь 2009 года). Как сторонники скорейшего и магистрального строительства БелАЭС, мы не могли пройти мимо такого знаменательного мероприятия. У нас - фанатиков белорусской атомной программы, властей Дании и глав национальных делегаций в датской столице, обязанных, казалось бы, подписать там новый киотский протокол, масса общего. Оба лагеря кладут прибор на общественное мнение, исходят из сиюминутных задач, игнорируя возможные глобальные последствия проблематики. Наконец, если кто-то залупается против их затей, те и другие готовы в качестве аргумента пустить в ход дубинки. Саммит в Копенгагене, безусловно, дал нашим чиновникам урок - как надо реагировать на экологические вызовы современности. Только так - не обращать внимания на нытьё и академический трёп, идти вперед. Тех, кто будет возникать при этом - упаковать на нары. Climate change и отечественная атомная программа - это сила!

# ПРАГНІЛА НЕШТА Ў ДАЦКІМ КАРАЛЕЎСТВЕ!

**Беларуская Партыя Зялёныя патрабуе ад дацкіх уладаў вызвалення беларускага грамадзяніна, арыштаванага падчас кліматычных пратэстаў у Капенгагене.**




**Беларускія адмарозкі прабраліся нават на радзіму Андэрсэна!**

### Заява Беларускай партыі «Зялёныя» з нагоды рэпрэсій супраць удзельнікаў кліматычных пратэстаў у Капенгагене.

7-18 снежня 2009 года ў Капенгагене (Данія) праходзіла канферэнцыя ААН наконт зменаў клімата (COP15). У гэтыя дні ў горад з'ехаліся не толькі ўрадавыя дэлегацыі, але і многія ўдзельнікі няўрадавых арганізацый і сацыяльных рухаў.

Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і рухаў прыехалі, каб агучыць сваё меркаванне наконт глабальнага кліматычнага крызісу, каб зрабіць свой голас пачутым на перамовах. У большасці рэгіёнаў свету ужо зараз адчуваюцца наступствы зменаў клімату: больш частыя і суворыя прыродныя катаклізмы (ураганы, паводкі, засухі), выкліканыя імі неўраджаі і руйнаванні. Многія тысячы людзей ужо сталі кліматычнымі ўцекачамі, і такі лёс можа чакаць сотні мільёнаў і нават мільярды.

Відавочна, што менавіта існуючая сацыяльна-эканамічная сістэма завяла чалавецтва ў тупік. Як паказалі 15 год пасля ўступлення ў сілу Рамкавай канвенцыі ААН па зменах клімату, гэтая сістэма не паддаецца перабудове і толькі паглыбляе крызіс. Менавіта патрабаванне «змяніць сістэму, а не клімат» і спрабавалі данесці актывісты да розуму удзельнікаў перамоваў.

Але іх галасы былі брутальна задушаныя. З самага пачатку COP15 паліцыя дэманстратыўна прадпрымала залішнія меры бяспекі з мэтай запалохаць кліматычных актывістаў. На

Працяг на с. 3


© «Мірны Атам»
Заснавальнік: Беларуская Партыя «Зялёныя»

Галоўны рэдактар: гандляр беларускім паветрам ў Празе Юры Стэфанішын

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ: 220030, Мінск, а/с 34

mirnyatom.net@gmail.com
http://mirnyatom.net

Наклад: 290 экз.
Нумар падпісаны ў друк: 15.12.2009
8 палос фармату А4
Спасылка на «Мірны Атам» абавязковая.
Надрукавана на абсталяванні рэдакцыі.

ISSN 2073-9893



## ЭКОРЕКЛАМА



**НЕ ТОРМОЗИ!**

**МЕНЯЙСЯ ВМЕСТЕ С КЛИМАТОМ!**

# КАПЕНГАГЕН, 1984/2009: ХРАНАЛОГІЯ ПАДЗЕЙ

**Самай сціслай квінтэсэнцыяй капенгагенскага настрою аўтара можа стаць адна лічба: 1984. Першы ўспамін пра паездку, які прыходзіць у галаву, - налепкі на слупах па цэнтры горада. Малапрыкметныя такія (іх, відаць, таму не надта і здзіралі): на шэрым фоне кола са светлых еўразвязаўскіх зорачак, унутры кола - 1984, і ў куточку дробна: George Orwell.**




Горад быў акупаваны грамiламi ў цёмна-сiняй форме. Яны захоўвалi ананiмнасць: толькi часам на форме былi нумары аддзелаў, i нiколi нiводзiн парсюк не паведамiў рэпрэсаваным удзельнiкам пратэстаў сваё прозвiшча.

У небе ўвесь час (нават уночы!) вiсеў хаця б адзiн палiцэйскi верталёт. Палiцэйскiя мiкрааўтобусы i легкавiкi круглыя суткi лёталi туды-сюды (часта з уключанай сiрэнай) без бачнай прачыны, проста каб панэрваваць публiку. Па цэнтры горада i вакол Бэла-цэнтра, дзе праходзiлi перамовы, натоўпамi хадзiлi патрулi палiцыi (ў тым лiку ў цывiльным) i вайскоўцаў. У любым месцы горада ў любога мiнака маглi праверыць дакументы i змесцiва сумкi, а калi штосьцi падасца падазроным (паглядзеў скоса, напрыклад) - завiнцiць для больш блiзкага знаёмства. Затрыманне працягласцю да 12 гадзiн можа быць «прэвентыўным»: «каб не нарабiў чаго».

У атмасферы татальнага пошуку «злачынцаў» (дакладней людзей, якiх лягчэй такiмi абвясцiць) i прайшлi перамовы COP15. Мы прапануўваем храналогiю падзей гарачых снежаньскiх дзён у Капенгагене.

**26 лiстапада**

Спешна прыняты комплекс паправак у заканадаўства Данii, якi iстотна пашырыў паўнамоцтвы палiцыi i павялiчыў пакараннi за акты грамадзянскага непадпарадкавання. Усе папраўкi ўступiлi ў дзеянне да пачатку клiматычнага самiта. Каментатары кажуць пра закат дацкай дэмакратыi.

**28 лiстапада**

Дэманстрацыя ў Жэневе супраць Сусветнай гандлёвай арганiзацыi (WTO). 29 i 30 лiстапада ў Жэневе працягвалiся акцыi супраць WTO i абмеркаваннi альтэрнатыў ёй. Адтуль двумя шляхамi стартаваў Караван сацыяльнай i клiматычнай справядлiвасцi (http://www.climatecaravan.org/), удзельнiкi якога праехалi праз гарады Францыi, Бельгii i Нямеччыны, каб сустрэцца ў Гамбургу i разам скiравацца да Капенгагену. Караван складаўся з прадстаўнiкоў нiзавых грамадскiх рухаў са ўсяго свету: новазеландскiх маоры (карэннага насельнiцтва выспаў), iндзiйскiх сялянак, беларускiх беспрацоўных i да т.п. Па дарозе адбывалiся прэс-канферэнцыi, сустрэчы з прадстаўнiкамi мясцовых сацыяльных рухаў i акцыi.

**7 снежня**

Пачатак афiцыйных перамоваў COP15. Па Капенгагене гуляе выплыўшы на паверхню з калiдораў улады чарнавiк магчымага Капенгагенскага пагаднення. Сярод iншага, у iм прапануўваецца аказваць фiнансавую i тэхналагiчную дапамогу краiнам, якiя развiваюцца, толькi пры выкананнi iмi складанага (i дарагога) нагляду за выкiдамi - самым бедным такое папросту не пад сiлу, а сам механiзм дакладнага кантролю за выкiдамi патрэбны перадусiм для ўмацавання рынку выкiдаў. Выканаўчы сакратар Рамкавай канвенцыi ААН па змене клiмата Іва дэ Бор на прэс-канферэнцыi перанакiроўвае пытаннi да дацкага прэм'ер-мiнiстра Ларса Локке Расмусена (маўляў, папера - з ягонага офiса, i да афiцыйнага перамоўнага працэса яна простага дачынення не мае). Данiю абвiнавачваюць у недэмакратычным «працягваннi» выгадных заможным краiнам рашэнняў. Удзельнiкi Пан-афрыканскага альянса клiматычнай справядлiвасцi прайшлiся маршам па Бэла-цэнтры ў знак пратэсту.

**8 снежня**

Пачалася змястоўная частка Klimaforum09 (http://www.klimaforum09.org/), «народнага клiматычнага самiта», як яго называюць арганiзатары (ўрачыстае адкрыццё адбылося напярэдаднi). Удзельнiкi разнастайных грамадскiх арганiзацый i сацыяльных рухаў да 18 снежня ўсебакова абмяркоўвалi праблемы клiмата, навакольнага асяроддзя, сацыяльнай справядлiвасцi.

**9 снежня**

Палiцыя прадпрыняла начны рэйд на месца начлегу некалькiх сотняў клiматычных актывiстаў па вулiцы Рагнхiльдгадэ. Канфiскаваныя «незаконныя матэрыялы»: напрыклад, расцяжкi да дэманстрацый i складныя лесвiцы. Насамрэч, незаконным быў рэйд: у актывiстаў быў кантракт з горадам, паводле якога палiцыя не мела права заходзiць на тэрыторыю. Дазвол на вобшук свiнюкi атрымалi ўжо пасля яго правядзення.

На нямецка-дацкай мяжы i на ўездзе ў Капенгаген палiцыя правярала i абшуквала аўтамабiлi i аўтобусы; некаторыя транспартныя сродкi трымалi на месцы па некалькi гадзiн.

Каля амбасады ЗША ў Капенгагене прайшоў мiтынг з патрабаваннем вывесцi войскi з Афганiстану.

**10 снежня**

На Klimaforum09 прынятая дэкларацыя, вытрымкi з якой вы можаце прачытаць у гэтым нумары «Мiрнага атаму».

**11 снежня**

Актывiсты з Climate Justice Action (http://www.climate-justice-action.org/) i Never Trust A Cop (http://nevertrustacop.org/) спрабавалi сарваць хаця б адну з мноства сустрэч бiзнэса цi патурбаваць якую-небудзь карпарацыю (http://notyourbusiness.hacklab.dk/). Але, блакаваныя палiцыяй, нiчога не здолелi зрабiць. Затрыманыя дзесяткi людзей, у тым лiку 11 валанцёраў першай дапамогi, за якiмi палiцыя адмыслова ганялася.

**12 снежня**

Ранiцай уплывовая i вялiкая мiжнародная сетка няўрадавых арганiзацый Friends of the Earth («Сябры зямлi») наладзiла дэманстрацыю «Паводка за клiматычную справядлiвасць» (http://www.copenhagenflood.org/). А першай гадзiне дня з парламенцкай плошчы (Christiansborg Slotsplads) стартавала вялiкая дэманстрацыя (http://12dec09.dk/), якая сабрала да 100 тысяч удзельнiкаў. Кажуць, што «чорны блок» разбiў шыбы ў Капенгагенскай клiматычнай бiржы, дзе займаюцца гандлем паветрам. Адзiны i маналiтны «чорны блок» i разбiтыя шыбы мне здаюцца нейкiм мiфам, але палiцыi вельмi хацелася да нечага дачапiцца - яна i дачапiлася. Палiцыя рассякла мiрную дэманстрацыю, выдзелiўшы з яе некалькi блокаў. 968 чалавек затрымана. Падаўляючая большасць адпушчана праз некалькi гадзiн без якiх бы тое нi было абвiнавачванняў. У часе затрымання парсюкi здзекавалiся з людзей разнастайнымi спосабамi: прымушалi некалькi гадзiн запар сядзець у нязручнай позе на халодным асфальце, не давалi наведваць прыбiральню, пiць i есцi. Пры спробах затрыманых заяўляць свае правы свiнюкi прымянялi сiлу i запалохвалi. Рукi затрыманых былi так сцiснутыя кайданкамi за спiнай, што сляды нагадвалi пра сябе яшчэ некалькi тыдняў. Сярод беспадстаўна затрыма-

**Працяг. Пачатак на с. 1**

дацкай мяжы і ў Капенгагене спынялі і абшуквалі аўтобусы і аўтамабілі, каб не даць людзям своечасова даехаць да месца і прывезці неабходнае абсталяванне (напрыклад, камп'ютэры для незалежнага медыя-цэнтра). У горадзе спынялі людзей, каб абшукаць сумкі і ператрэсці змесціва кішэняў. Паліцыя праводзіла незаконныя (ў тым ліку начныя) рэйды на месцы начлегу, сацыяльныя цэнтры і прыватныя кватэры, каб затрымліваць актывістаў і канфіскаваць матэрыялы і абсталяванне для мірных дэманстрацый (напрыклад, расцяжкі ці ровары).

Мірныя і легальныя дэманстрацыі пастаянна падвяргаліся нападам з боку паліцыі, а іх удзельнікаў арыштоўвалі, збівалі, труцілі пярцовым газам. Агульная колькасць затрыманых і арыштаваных за тыдзень склала амаль дзве тысячы чалавек. Толькі ў дзень найбольш масавай дэманстрацыі 12 снежня было затрымана 968 чалавек. Падаўляючая большасць з іх была выпушчаная з паліцэйскіх пастарункаў без прад'яўлення якіх бы тое ні было абвінавачванняў, што паказвае беспадстаўнасць затрыманняў. Затрыманыя падвяргаліся здзекам і катаванням з боку паліцыі: іх па некалькі гадзін запар не вадзілі ў туалет, не давалі піць і есці, трымалі ў холадзе, збівалі, пагражалі. Затрыманым адмаўлялі ў праве звязацца з сям'ёй ці працадаўцам і ў праве на юрыдычную абарону (кантакт з адвакатам).

Усё гэта мы ведаем не з чужых словаў: прадстаўнікі БПЗ падвяргаліся і праверкам на вуліцах, і начному паліцэйскаму рэйду, і прэвентыўным затрыманням у Капенгагене.

Дацкай паліцыі развязалі рукі заканадаўчыя новаўвядзенні, прынятыя напярэдадні саміта – 26 лістапада 2009 года. Былі павялічаны памеры штрафаў і тэрміны зняволення за ўдзел у акцыях грамадзянскага непадпарадкавання, а паліцыя, сярод іншага, атрымала права затрымліваць людзей на 12 гадзін толькі на падставе таго, што нейкаму паліцэйскаму нехта “падаўся падазроным”. Міжнародныя ўдзельнікі снежаньскіх падзей раз'ехаліся, а падданыя дацкай каралевы застаюцца сам-насам з гэтай сістэмай перманентнага надзвычайнага становішча, гарантаванай законам.

18 снежня пад арыштам утрымлівалася 16 удзельнікаў пратэстаў. На дадзены момант у дацкіх турмах яшчэ чакаюць суда 7 чалавек, у тым ліку адзін грамадзянін Беларусі. Наколькі дазваляюць меркаваць наяўныя ў нас факты, усе гэтыя людзі з'яўляюцца невінаватымі і арыштаваныя беспадстаўна або ім інкрымінуюцца смеху вартыя абвінавачванні (напрыклад, двух дацкіх актывістак - Tannie Nyboe і Stine Gry Jonassen - трымалі тыдзень пад арыштам і судзілі за тое, што яны крычалі «штурхай!» / «Push!» падчас дэманстрацыі 16 снежня).

БПЗ выказвае рашучы пратэст супраць грубых парушэнняў базавых правоў чалавека і падставовых свабод у Даніі.

БПЗ патрабуе ад дацкіх уладаў неадкладнага вызвалення ўсіх палітычных зняволеных у Даніі, у тым ліку грамадзяніна Беларусі. Мы падтрымліваем дацкія грамадскія арганізацыі і рухі ў іх змаганні за адмену рэпрэсіўных законаў.

Не - паліцэйскім рэпрэсіям!

Так – салідарнасці!

Так кліматычнай і сацыяльнай справядлівасці!

28.12.2009

---

ных - актывісты з Беларусі, Расіі, Украіны.

У далейшым праз масавыя затрыманні фокус грамадскай увагі быў пераключаны з патрабаванняў дэманстрантаў на рэпрэсіі супраць іх. Усе спачувалі затрыманым, але з цяжкасцю маглі прыгадаць, за што ж яны выступалі перад тым, як трапіць у пастарункі.

**13 снежня**

Акцыя - спроба прыпыніць капіталістычную вытворчасць (http://htp.noblogs.org/), бо гэтая вытворчасць завяла нас у кліматычны крызіс і вядзе далей той самай дарогай. Паколькі на календары была нядзеля, аб'ектам атакі быў выбраны порт, які працуе бесперапынна. Але дэманстранты былі абкружаныя паліцыяй задоўга да таго, як дайшлі да мэты. Праведзеныя масавыя затрыманні. Сярод затрыманых быў грамадзянін Беларусі, якога абвінавацілі ў нападзе на паліцэйскага. На самой справе дэманстранты не атакавалі паліцыю, а самі былі беспадстаўна атакаваныя. У суд не было прадстаўлена ніякіх доказаў «злачынства», апрача вусных сведчанняў аднаго паліцэйскага. Тым не меней, абвінавачаны дагэтуль (на 12 студзеня) утрымліваецца пад вартай у чаканні канчатковых слуханняў па сваёй справе. Адначасна ў цэнтры горада ішоў невялікі мітынг Via Campesina супраць мясной індустрыі.

**14 снежня**

Дэманстрацыя за свабоду перамяшчэння людзей, за правы кліматычных уцекачоў і супраць дэпартацый. Акцыя выглядала трохі блякла, бо расцяжкі ды іншыя матэрыялы, якія рыхтавалі арганізатары, былі канфіскаваныя паліцыяй. Але на заканчэнне ў некаторых удзельнікаў мерапрыемства атрымалася павесяліцца. Фінішным пунктам дэманстрацыі быў парламенцкі пляц, пасярэдзіне якога стаяў надзіманы шар з рэкламай Дацкай энергетычнай агенцыі, якая пыжыцца зрабіць сабе «зялёны» імідж і пры гэтым адмаўляецца закрываць апошнюю ў Даніі вугальную электрастанцыю - адну з найбольшых крыніц выкідаў парніковых газаў у краіне. Па афіцыйным сканчэнні дэманстрацыі пэўныя спрытныя яе ўдзельнікі ўмудравалі адвязаць шар і пагнаць па вуліцы. Праўда, праз пару соцень метраў шлях перакрылі парсюкі з галоднымі сабакамі, натрэніраванымі кідацца на людзей. Весялуха скончылася, але затрыманых было мала.

Затое багата затрыманых (194) было ўвечары. У Хрысціяніі (аўтаномны самакіраваны квартал горада) іншыя аматары весялухі падпалілі барыкаду. Паліцыя пад'ехала пагрэцца і, не чакаючы, пакуль палятуць камяні, першай напусціла пярцовай газы ды акупавала Хрысціянію. З паветра акцыю забяспечваў верталёт з пражэктарам, дастаткова магутным, каб асвятляць той ці іншы цёмны кут квартала, як на далоні.

**15 снежня**

Дзень акцый у падтрымку арганічнай і арыентаванай на мясцовыя патрэбы сельскай гаспадаркі супраць буйнога аграпрамысловага бізнэсу, які спусташае планету. Міжнародны сялянскі рух Via Campesina (http://viacampesina.org/) наладзіў зусім-зусім пацыфісцкую дэманстрацыю, якая ўсё адно сутыкнулася з нападамі з боку паліцыі. Прадстаўнікам многіх няўрадавых арганізацый адмоўлена ў акрэдытацыі. Толькі 7 тысяч назіральнікаў з прыблізна 20 тысяч, якія раней мелі акрэдытацыю, могуць прайсці ў месца правядзення Канферэнцыі бакоў.

**16 снежня**

Пачатак міністэрскай фазы афіцыйных перамоваў. У Капенгаген з'ехаліся міністры экалогіі (навакольнага асяроддзя, аховы прыроды) усіх краін-бакоў Рамкавай канвенцыі ААН па зменах клімату, а таксама кіраўнікі многіх дзяржаў, у тым ліку Абама, Мядзведзеў, Сарказі ды іншыя.

Climate Justice Action праводзіла дэманстрацыю «Вярні сабе сілу!» ('Reclaim Power!'). У час, калі шэсце падышло да Бэла-цэнтра, з апошняга выйшла група памерам у пару соцень назіральнікаў і ўдзельнікаў афіцыйных перамоваў. Калі гэтая група паспрабавала далучыцца да дэманстрацыі, яе ўдзельнікі былі жорстка збітыя паліцыяй. Падкрэслю: гэта былі людзі рознага веку (ў тым ліку сталага) і роду (шмат жанчын). Яны не ставілі на мэце прарвацца на тэрыторыю Бэла-цэнтра, а, наадварот, пакідалі яе. Збіццё і пярцовы газ зазналі і ўдзельнікі асноўнай дэманстрацыі. Тым не меней, яны правялі Народную кліматычную асамблею каля агароджы Бэла-цэнтра, а пасля прайшлі маршам ў Хрысціянію.

**17 снежня**

У Бэла-цэнтр пусцілі толькі 300 прадстаўнікоў грамадскасці. Астатнім нічога не застаецца як арандаваць канферэнц-залу і сачыць за ходай саміта па паведамленнях прэсы і сваіх нешматлікіх калег унутры.

Тым часам афіцыйная канферэнцыя буксуе.

**18 снежня**

На парламенцкай плошчы - мітынг салідарнасці з арыштаванымі ўдзельнікамі пратэстаў. У Бэла-цэнтры - апошні дзень Канферэнцыі бакоў. Ніводзін назіральнік ад няўрадавай арганізацыі не дапушчаны, пазбавілі акрэдытацыі і многіх журналістаў.

Прапанаванае Баракам Абамам на ультыматыўнай аснове «падпісвай-ці-ідзі-гуляй» (папярэдне абмяркоўвалася з прадстаўнікамі Кітая, Індыі, Бразіліі і Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі) і падпісанае толькі 28-ю (пераважна еўрапейскімі) дзяржавамі Капенгагенскае пагадненне не з'яўляецца юрыдычна абавязваючым, мае на мэце зусім нязначнае зніжэнне выкідаў, замацоўвае гандаль парніковымі газамі і вельмі расплывіста кажа пра дапамогу багатых дзяржаў бедным. Тым не меней генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун заахвочвае іншыя ўрады далучацца да сумніўнага пагаднення, чым моцна падрывае давер да кіруемай ім арганізацыі. Кіраўнікі буйнейшых краін «глабальнай поўначы» (ЗША, Францыі) спрабуюць заяўляць пра дасягнуты поспех, але фактычна, саміт, на які ўскладалася столькі надзей, скончыўся пшыкам, зайшоў у тупік.

Як падсумавала знакамітая канадская журналістка Наомі Кляйн, пагадненне не ёсць «нічым болей, як толькі неахайным пактам паміж найвялікшымі забруджвальнікамі свету: я зраблю выгляд, што ты робіш нешта са зменамі клімату, калі ты зробіш выгляд, што я раблю. Па руках? Па руках».

**19 снежня**

Насамрэч Капенгагенскае пагадненне было ўхвалена толькі паміж 10 і 11 гадзінамі раніцы - праца канферэнцыі не спынялася ўсю ноч...

P.S. Варта пазначыць, што гэты пералік падзей і мерапрыемстваў закранае толькі найбольш значныя і пераважна тыя, якія шырока асвятляліся незалежнымі (некарпаратыўнымі) медыя. З яго выпалі разнастайныя дробныя акцыі прамога дзеяння накшталт начной атакі на амбасаду Ісландыі. Таксама сюды не трапілі невялікія пікеты і мітынгі, вывешванні расцяжак ды іншыя падзеі грамадскага жыцця дацкай сталіцы двух турботных снежаньскіх тыдняў.

# ИЗМЕНИТЬ СИСТЕМУ, А НЕ КЛИМАТ!

## НАРОДНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ, ПРИНЯТАЯ НА KLIMAFORUM09

**Выходы из климатического кризиса существуют. Люди и планета нуждаются в справедливом и устойчивом преобразовании наших обществ к форме, которая гарантирует права на жизнь и достоинство всех народов и передаст следующим поколениям более плодородную планету и более полноценные жизни.**

Мы, участвующие в Klimaforum09 в Копенгагене народы, сообщества и организации, призываем каждого человека, все организации, правительства и институты, включая Организацию Объединённых Наций (ООН), приложить силы к этому необходимому преобразованию. Это будет непростым заданием. Современный кризис имеет экономические, социальные, экологические, геополитические и идеологические аспекты, которые взаимодействуют и усиливают друг друга, как усиливают и климатический кризис. Поэтому мы призываем к безотлагательным действиям относительно климата.

- Полный отказ от ископаемого топлива в ближайшие 30 лет, что должно включать определённые промежуточные цели на каждую пятилетку. Мы требуем немедленного снижения выбросов парниковых газов индустриализированными странами по крайней мере на 40% к 2020 году по сравнению с уровнем 1990 года.
- Признание, выплата и компенсация климатического долга за сверхпотребление атмосферного пространства и неблагоприятные эффекты изменений климата для пострадавших групп и людей.
- Отрицание ориентированных исключительно на рынок и безусловную веру в технологии ложных и опасных решений, таких, как атомная энергетика, агро-топливо, улавливание и хранение углекислого газа, «Механизмы чистого развития», древесный уголь, генетически «подготовленные к изменениям климата» культуры, гео-инженерия и «уменьшение выбросов от обезлесения и деградации лесов» (REDD). Эти «решения» лишь углубляют социальные и экологические конфликты.
- Действительные решения климатического кризиса, основанные на безопасном, чистом, возобновляемом и устойчивом использовании природных ресурсов. Переход к пищевой, энергетической, земельной и водной независимости.

Мы требуем, чтобы конференция COP15 достигла соглашения, которое инициирует восстановление экологического, социального и экономического баланса планеты Земля экологически, социально и экономически приемлемыми и справедливыми средствами. Мы требуем, чтобы результатом работы COP15 стал юридически обязывающий договор (...).

Неблагоприятное воздействие вызванных человеком изменений климата приводит к грубым нарушениям прав человека. Вс

Мы, участвовавшие в Klimaforum09 народы и организации, принимаем на себя обязательство продолжать наше полное и активное участие в пропаганде такого преобразования общества, которое потребует фундаментальных изменений в социальных, политических и экономических структурах и исправления гендерных, классовых, расовых, возрастных и этнических неравенств и несправедливостей.

Это требует восстановления демократической самостоятельности наших местных сообществ и их роли базовых социальных, политических и экономических единиц. Местное и демократическое владение природными ресурсами, контроль над ними и доступ к ним будет основой для осмысленного и устойчивого развития сообществ и одновременно для снижения выбросов парниковых газов. Также существует необходимость в более сильных региональных и международных соглашениях для управления общими и нераздельными ресурсами, как и в более сильной и демократичной ООН.

Мы призываем всех неравнодушных людей, все социальные движения и культурные, политические или экономические организации присоединиться к нам в создании сильного глобального движения движений, которое сможет выдвинуть представления и требования народов на всех уровнях общества. Вместе мы можем произвести глобальные преобразования к устойчивому будущему.

### 1. Преамбула

Выходы из климатического кризиса существуют. Люди и планета нуждаются в справедливом и устойчивом преобразовании наших обществ к форме, которая гарантирует права на жизнь и достоинство всех народов и даст ныне живущим и последующим поколениям более плодородную планету и более полноценные жизни. Это преобразование должно быть основано на принципах солидарности — особенно в отношении наиболее уязвимых — отказе от дискриминации, гендерном равенстве, справедливости и устойчивости, а также признании того, что мы — часть природы, которую мы любим и уважаем. Тем не менее, чтобы решать климатический кризис, нужны повышение сознательности и решительные действия, основанные на соблюдении прав человека. Все государства обязаны взаимодействовать на международном уровне, чтобы обеспечить уважение к правам человека по всему миру в соответствии с Уставом Организации Объединённых Наций. (...).




**Глобальное потепление - прекрасно! Это доказывает эволюция женского нижнего белья.**

### 2. Вызов, как мы его видим

Концентрация парниковых газов в атмосфере уже настолько высока, что климатическая система вышла из равновесного состояния. Концентрация углекислого газа ($CO_2$) и глобальные температуры за последние 50 лет росли быстрее, чем когда-либо ещё в истории Земли, и будут расти ещё быстрее в ближайшие десятилетия. Это добавляется к множеству других серьёзных экологических дисбалансов, влияние которых угрожает жизням и средствам к существованию людей во всём мире, а если более точно, бедняков и других уязвимых групп.

Дисбаланс климатической системы ведёт, среди прочего, к большим и более частым экстремальным периодам жары и дождей, тропическим циклонам, ураганам и тайфунам, чрезвычайным наводнениям и засухам, потере биоразнообразия, оползням, поднятию уровня моря, нехватке питьевой воды, более коротким вегетационным периодам, снижению урожайности, потере пришедших в упадок сельскохозяйственных земель, снижению продуктивности сельского хозяйства, потерям поголовья скота, вымиранию экосистем и снижению поголовья

рыб. Эти явления приводят к пищевому кризису, голоду, болезням, смерти, вынужденному перемещению людей и исчезновению устойчивых образов жизни. С этим взаимодействует введение генетически модифицированных организмов (ГМО), монокультурных плантаций и индустриализированного сельского хозяйства, имеющее большую поддержку со стороны корпораций. Эти нововведения серьёзно угрожают стабильности и разнообразию экосистем, маргинализируют и обедняют малых фермеров и подрывают пищевую независимость. (...).

### 3. Причины, как мы их видим

Непосредственной и основной причиной вызванных человеком изменений климата являются беспрецедентные выбросы парниковых газов в атмосферу преимущественно из-за воз-



растающего сжигания ископаемого топлива в промышленных, коммерческих, транспортных и военных целях. Другими важными причинами изменений климата являются деградация лесов (...).

Эти непосредственные причины являются результатами неустойчивой глобальной экономической системы, основанной на неравном доступе к ограниченным ресурсам планеты, неравном контроле над ними и неравном распределении выгод от их использования. Эта система основана на присвоении местных, национальных и планетарных общих богатств местными и глобальными элитами. То, что превозносилось как великие шаги вперёд в технологии, производстве и человеческом прогрессе, на деле приближало глобальные экологические и социальные катастрофы. (...).

### 4. Справедливое и устойчивое преобразование

Очевидно, что решение климатического кризиса требует далеко идущих трансформаций, исключённых в настоящее время из повестки дня политиков в национальных правительствах и многосторонних институтах. Народ призывает к системным изменениям, а не «ведению дел как обычно» и некритичному использованию технологических и рыночных «решений», к которым могущественные интересы свели климатическую повестку дня (...).

Некоторыми из шагов к устойчивому преобразованию являются:

- Пищевая независимость и экологическое сельское хозяйство. Поддержка прав народов, сообществ и стран определять их собственные системы производства, включая сельскохозяйственную, рыболовную, пищевую, лесохозяйственную и земельную политику, соответствующую обстоятельствам в экологическом, социальном, экономическом и культурном смыслах (...).
- Демократические владение и контроль над экономикой. Реорганизация производственных единиц общества вокруг более демократичных форм владения и управления для того, чтобы удовлетворить базовые потребности людей; например, создание занятости, доступ к воде, жилищам, земле, здравоохранению и образованию, пищевая независимость и экологическая устойчивость (..._.
- Энергетическая независимость. Резкое снижение потребления энергии, особенно в богатых странах. Использование энергетики на возобновляемых источниках, а именно солнечной, ветряной, геотермальной, малой гидроэнергетики, энергетики волн и приливов (...).
- Экологическое планирование городских и сельских зон. Целью является радикальное снижение потребления энергии и ресурсов и образования отходов и загрязнения при одновременной поддержке местного производства для удовлетворения базовых нужд граждан (...).
- Образование, наука и культурные учреждения. Переориентировать общественные исследования и образование на удовлетворение потребностей людей и окружающей среды вместо современной направленности на разработку коммерчески прибыльных и запатентованных технологий (...).
- Конец политики милитаризма и войнам.

Одним из аспектов этой концепции является восстановление местного сообщества (а не глобального рынка) в качестве базовой социальной, политической и экономической единицы. Социальное единение, демократическое участие, экономическая подотчётность и экологическая ответственность могут быть достигнуты только через восстановление принятия решений на самом низком уровне. Это основной урок, который мы вынесли из наследия этнических культур и местных сообществ (...).

### 5. Пути к преобразованию

Многие люди вовлечены в создание на практике более устойчивых промышленности, сельского и лесного хозяйства, рыболовецкого промысла, а также в расширение сектора возобновляемой энергетики. Эти инициативы внутри системы создали альянсы с другими секторами общества, профсоюзами, потребителями, городскими жителями, учителями и исследователями, которые стремятся к устойчивым образам жизни.

Мы вынуждены обратиться к участникам переговоров ООН по изменениям климата и 15-й Конференции сторон (COP15) Рамочной конвенции ООН по изменению климата (РКИК ООН). Уроки, извлечённые из прошлых раундов переговоров, нельзя назвать многообещающими. (...). Ситуация скорее ухудшилась, поскольку принципы, цели и временные рамки как конвенции, так и протокола мало продвинулись вперёд.

Интересы тех же самых больших корпораций, которые в значительной степени создали климатический кризис, оказывают громадное влияние на климатическую политику на национальном и глобальном уровнях. Мы однозначно выступаем против этого антидемократического влияния корпоративного лобби на проходящие сейчас переговоры COP. (...). Мы требуем, чтобы на COP15 было достигнуто соглашение, которое инициирует восстановление природного, социального и экономического баланса планеты Земля экологически, социально и экономически приемлемыми и справедливыми средствами. Мы требуем, чтобы результатом работы COP15 стал юридически обязывающий договор.

### 6. Глобальное движение за устойчивое преобразование

Независимо от результата Копенгагенского саммита по изменению климата, перед нами стоит неотложная задача выстроить глобальное движение движений, приверженного долговременной задаче пропаганды устойчивого преобразования наших обществ. В противоположность преобладающим властным структурам, это движение должно расти снизу вверх. Нам нужен широкий союз экологических и социальных движений, профсоюзов, фермеров, гражданского общества и других дружественных сил, которые могут взаимодействовать в ежедневной политической борьбе как на местном, так и на национальном и международном уровнях. Такой союз одновременно влечёт за собой создание и нового сознания, и новых типов общественного активизма, и должен быть способен не только реагировать на неустойчивые практики, но и показывать пример того, как новая устойчивая экономика может по-настоящему функционировать (...).

**Полный текст декларации см. на сайтах www.belgreens.org и www.mirnyatom.net**

# УСХОДНЕЎРАПЭЙСКІ БЛЁК НА ПРАТЭСТАХ СУПРАЦЬ COP15. ХРОНІКА

**З 7 па 18 сьнежня ў Капэнгагене (Данія) адбывалася чарговая 15-я рамкавая канфэрэнцыя ААН па пытаньнях зьменаў клімату, альбо па-просту 15-я Канфэрэнцыя ўдзельнікаў, COP15. Галоўнай задачай канфэрэнцыі мусіў стаць разгляд лёсу Кіёцкага пратаколу, тэрмін дзеяньня якога падыходзіць да канца.**

У супрацьвагу афіцыйнаму мерапрыемству праводзіўся, як гэта звычайна ў Эўропе бывае, контрсамміт "KlimaForum-09", арганізаваны разнастайнымі недзяржаўнымі экалягічнымі арганізацыямі, на якім кожны ахвотны мог папрысутнічаць на выступах, паўдзельнічаць у дыскусіях і т.п.

Арганізатарам усіх вулічных мерапрыемстваў зьяўлялася сетка CJA, якая аб'ядноўвае шмат асоб і арганізацый з усяго сьвету. Яе ўдзельнікі прадстаўляюць вельмі розныя палітычныя спэктры, па рознаму адносяцца да радыкальных дзеяньняў, але для ўсіх іх "сьвятарнай каровай" зьяўляецца "дэмакратыя". Калі паспрабаваць апісаць іх некалькімі словамі, то найбліжэй будзе "прыхільнікі грамадзянскага непадпарадкаваньня", гэтаксама як, напрыклад, BlockG8. Некаторыя удзельнікі CJA таксама ўдзельнічалі ў арганізацыі Клімафоруму, таму й ня дзіва, што галоўным лёзунгам і Клімафорума й CJA быў з выгляду радыкальны, але па сутнасьці рэфармісцкі "Change the system, not the climate" (Зьмяняй сыстэму, а не клімат).

Прадстаўнікі радыкальных антыкапіталістычных плыняў, найперш анархісты, утварылі міжнародную сетку "Never Trust a COP". Ейныя ўдзельнікі мяркуюць, што віной кліматычнах зьмен зьяўляецца ненажэрны капіталізм, і пакуль ён ня будзе ліквідаваны, і заменены эканомікай, у цэнтры якой стаіць Чалавек, а не Капітал, усе спробы спыніць кліматычны хаос асуджаныя на няўдачу.

### Пратэсты

У Капэнгаген асноўная часка будучага ўсходнеэўрапэўскага блёку (беларусы, крыху ўкраінцаў і расейцаў) прыбыла 8 сьнежня. Празь некалькі дзён пад'ехала банда полькіх анархаў. Першыя дні мы займаліся вывучэньнем горада, шукалі аб'екты інфраструктуры пратэстаў (індымэдыю, інфашопы і г.д.), шукалі знаёмых зь іншых краёў.

### 11 сьнежня

Першая акцыя мусіла адбыцца 11 сьнежня. Гэта была антыкарпаратыўная акцыя пад лёзунгам Don't Buy the Lie! (Не купляй хлусьні!). Яна была накіраваная супраць карпарацый, якія актыўна займаюцца г.зв. greenwashing-ам, г.зн. ствараюць сабе імідж зялёных, прязных да экалёгіі, напрыклад Siemens (які вырабляе ў тым ліку й атамныя рэактары) і Watenfall (нямецкі апэратар АЭС) зьўляліся спонсарамі афіцыйнага "зялёнага" музычнага фэстывалю Hopenhagen, прымеркаванага да COP15. Меркавалася, што удзельнікі акцыі разаб'юцца па некалькіх групах, якія пойдуць кожная да свайго аб'екта (напрыклад, бізнэсцэнтра) і будуць перашкаджаць офіснаму планктону зарабляць грошы для капіталістаў. У кожнай з гэтых груп былі падгрупы: візуальная (несьлі банэры, улёткі і т.п., шумавая (самба й т.п.), унутраная (якія пранікалі ў будынкі й чынілі там вэрхал) і вонкавая (мусіла блякаваць уваходы да будынка, каб мянты не маглі зайсьці, а ўнутраная група, наадварот, змагла выйсьці)). Бальшыня нашага блёку была занятая падрыхтоўкай да заўтрашняй дэмы, і сюды не хадзіла, таму глядзіце архівы дацкай індымэдыі, але акцыя хутчэй правалілася, бо толькі адна з чатырох груп здолела патрапіць у свой аб'ект.

### 12 сьнежня

На 12 числo была прызначаная вялікая дэма Flood for Climate Justice, якая па розных ацэнках сабрала ад 60 да 100 тысяч чалавек. А па ўсім сьвеце мусіў адбыцца Глябальны дзень дзеяньняў. Арганізатары плянавалі весьці дэму ад цэнтру горада да Bella Centre, дзе адбывалася канфэрэцыя. Але Бэлацэнтар знаходзіцца на самым ускрайку горада, між палёў і прамысловай зонай, таму ісьці туды было проста глупствам, бо кім будзе пачутая гэтая дэма? Калі стаў вядомы машрут дэмы сетка "Never Trust a COP" заклікала не ісьці на ўскраіну, а застацца ў цэнтры й атакаваць аб'екты капіталістычнай індустрыі, балазе іх там навалам: біржа, нацбанк, дацкі банк, некалькі вуліц зь вельмі дарагімі крамамі. Адпаведнага зьместу ўлёткі "Green peace — green police" раздаваліся перад самай дэмай, але голас розуму ня быў пачуты. Больш таго, дзякуючы эфэктыўнай працы дацкіх мянтоў, правёўшых некальні арыштаў, была парушана сувязь дацкіх і скандынаўскіх радыкалаў з астатнімі эўрапэйцамі, у выніку ў дэме ўдзельнічалі два чорных блёкі: спачатку маленькі, ня большы за 200 чалавек, а бліжэй да канца блёк пад 1000 чалавек. Як толькі ўдзельнікі першага блёку дайшлі да будынку біржы, яны атакавалі яго з дапамогай камянёў і малаткоў, паліцыя была негатовая да гэтага й папросту разьбеглася. Калі ж зьявіліся экіпіраваныя атрады мясцовага АМАПу, то чорны блёк зьліўся з асноўнай дэмай. Нажаль, у другім блёку з-за шуму дэмы й вялікай адлегласьці нават не пачулі пра пачатак задымы.

Такім чынам дэма працягвала рушыць далей, пакуль на адной з вуліц той "другі" чорны блёк ня быў заблякаваны сьвіньнямі. Разам зь імі былі заблякаваныя ўдзельнікі антыатамнага блёку, нейкія крышнаіты і многія іншыя. І што ў гэтай сытуацыі зрабілі НДА-шныя арганізатары дэмы? Павялі ейны "хвост" па іншых вуліцах, каб абыйсьці заблякаваных людзей. А што зрабілі ўдзельнікі дэмы, усе гэтыя НДА-шнікі, сацыялісты і інш.? Пайшлі далей да Бэлацэнтра. Бо ў іх ёсьць важная мэта: сярод палёў і балот пракрычаць лёзунгі супраць глябальнага пацяпленьня, а тысяча чалавек, якім абсалютна ні за што надзелі пласьцікавыя наручнікі-сьцяжкі й пасадзілі на некалькі гадзін на халодны асфальт, гэта ня важна, бо яны, напэўна, хуліганы й хацелі сарваць важнае мерапрыемства. І



**Падпальваючы кактэйлі молатава, моладзь знішчала астаткі азонавага пласта**

толькі нейкая сотня людзей засталася хаця б маральна падтрымаць затрыманых.

Каля 21-й вечара была праведзеная невялічкая мірная дэма салідарнасьці з затрыманымі, але яна была разагнаная мянтамі.

### 13 сьнежня

Дзьве акцыі: фэрмэрская сетка Via Campesina праводзіць дэму супраць мяснай індустрыі, CJA ў гавані ладзіць акцыю Hit the production!. Нехта йдзе на акцыю Кампэсіны, нехта ў гавань.

У гавані меркавалася з аднаго боку масавая блякада, якая, з аднаго боку, мусіла паралізаваць працу, а з другога, не дапусьціць мянтоў да актывістаў, якія б малымі групамі рабілі ўсё, што заўгодна. Тоє, што акцыя правалілася, стала вядома

ўжо на месцы збору, бо прысутнічала толькі пара-тройка соцень чалавек, дый з тых ці не палова звалілі па дарозе, калі справа запахла хапуном. Па дарозе ў гавань раздаваліся кусачкі, каб зразаць з кантэйнэраў апазнавальныя знакі, і гэтак перашкодзіць іхнаму транспартаваньню. Чым бліжэй набліжалася дэма да гавані, тым шчыльнейшым станавілася коля мянтоў, некаторыя дэманстранты пачалі "губляць" кусачкі. Ці то з-за "скідваньня" кусачак, ці то з-за таго, што з машыны гукавой сыстэмы неслася "Fuck The Police" N.W.A. (напэўна дацкія мянты ня любяць рэпераў, якія ня любяць мянтоў), але раптам riot-cops атакавалі грузавік з мэтай сьцягнуць людзей, якія ехалі на ім, завязалася невялікая бойка, адзін беларус зарадзіў мянту, той пакрыўдзіўся й запомніў нашага таварыша. Нарэшце мянты захапілі грузавік і цалкам абкружылі дэму. Было прадпрынята некалькі няўдалых спроб прарыву, і ў выніку ўдзельнікі дэмы (пара соцень чалавек) былі затрыманыя і перапраўленыя ў часовую турму.

Што сабой уяўляла гэтая турма: звычайны ангар для мянтоўскіх машын, у якім усталявалі мноства клетак памерам 23 мэтры, з мэталічнымі дзьвярамі мужчынскія, з ДВП-шнымі



**Нават блазны атрымалі па каўпаках!**

- жаночыя, у клетцы было па 10-12 чалавек. У кожнай клетцы 4 лавы, 3 турысцкія пенкі й просьціна. Прывезеных у турму пасадзілі "ялінкай" на падлогу, балазе не на голую, а на пенкі (затрыманых 12-га садзілі проста на бэтон). Пасьля па адным выклікалі на шмон, фотканьне і праводзілі ў клетку, без абутку й цёплага адзеньня, а тэмпэратура там была градусаў мо' 15. Затое з папераў, у якой быў сьпіс усіх правоў затрыманага. Празь нейкі час нашага таварышы, "пакрыўдзіўшага" мянта, аграмаднага жлаба ў пласьцікавых досьпехах, вывелі з камэры й павялі ў невядомым напрамку.

Увесь гэты час затрыманыя, і ў клетках, і яшчэ не заведзеныя туды, шумелі як толькі маглі: сьпявалі песьні, крычалі лёзунгі, лупілі рукамі-нагамі па сьценках. Мянты паводзілі сябе зусім ня так як у нас: нікога ня пізьдзілі, і "ластаўку" не рабілі, а заткнулі вушы бірушамі ці надзелі навушнікі, дэмакратыя, тваю маць.

Праз нейкі час сядзеньня ў камэры некаторым чувакам гэта надакучыла, й яны зламалі дзьверы сваёй камэры й выйшлі зь яе. Адразу наляцелі мянты, й запіхнулі іх назад, а потым пачалі па адным пераводзіць сядзельцаў у іншую клеткі. Тыя, хто сядзеў па іншых клетках узьнялі дзікі вэрхал: шумелі, крычалі, адрывалі лаўкі й спабавалі выламаць імі дзьверы. На дапамогу звычайным мянтам выклікалі riot-cops, якія панапускамі пярцовага аэразолю ў камэры, дзе ламалі дзьверы, а потым урываліся ў клеткі і... не, нікога не білі, а проста забіралі лавы, пенкі, бутэлькі з вадой (гэта страшная шумавая зброя :)). І, каб "ахаладзіць" нас, адчынілі на вуліцу дзьверы ангара.

Такім чынам, адседзелі мы па 6—7 гадзін, а потым паразьвезьлі нас аўтобусамі па розных станцыях гарадзкой электрычкі, і мы паехалі на месца ўпіскі. На заўтра вырашылі ўзяць выходны.

**14 сьнежня**

Раніцоў стала вядома, што ўночы малыя групы па ўсім горадзе атакавалі аб'екты капіталу: банкі, бізнэсцэнтры, кажуць, спалілі мянтоўскую машыну.

Дэма No Borders Action! No Climate Refugees!, і нейкая акцыя "Reparations for Climate Debt!". На антыгранічнай акцыі мусіла адбыцца блякада будынку Мінабароны. Мы палічылі, што будзе такі ж правал, як і ў гавані, і вырашылі не адмяняць свой выходны, а лепей схадзіць на Legal Team і напісаць скаргі на неправамерныя дзеяньні мянтоў 12 і 13 сьнежня.

Але на дэму прыйшло паболей людзей, і хоць па дарозе ейныя шэрагі парэдзелі, да Мінабароны дайшло каля 1000 чалавек. На плошчы, дзе знаходзіўся будынак МА, быў усталяваны надзіманы COP15-шны глёбус, дэманстранты пачалі цягнуць яго на сябе, мянты на сябе, дэманстранты перамаглі й сьцягнулі шар.

Хто ня змог павесяліцца ўночы з 13-га на 14-е, вырашылі адарвацца на Хрысьціяніі, дзе з 17-ці гадзін адбывалася "Reclaim Power Party!", прысутнічала шмат пратэстуючых, выступалі Наомі Кляйн і агідны сацыял-дэмакрат Майкл Хардт. Задума была простая: пабудаваць на ўваходах у Хрысьціянію барыкады, пасьля напасьці непадалёк на мянтоў, тыя паклічуць сваіх, пойдуць на Хрысьціянію, а хрысьціянцы й удзельнікі вечарынкі падпішуцца за "чорны блёк". А ў сапраўднасьці адбылося так: барыкады не дарабілі, каменьня не нанасілі, дый хрысьціянцы ўжо даўно не бунтаўшчыкі, а звычайныя аматары "пляну", якіх цалкам задавальняе іхны фактычны статус "экзатычнага раёна". Таму, першыя атрады мянтоў проста пастрэльвалі ад уваходу газавымі гранатамі, а потым у раён падцягнуліся пару тысяч мянтоў, і паказалі хто ў Хрысьціяніі сапраўдны гаспадар. Як вынік каля 200 затрыманьняў.

**15 сьнежня**

Дэма Resistance is ripe!, прысьвечаная сельскай гаспадарцы. І хоць тэма, насамрэч, вельмі важная, мы вырашылі працягнуць выходны. Яшчэ была нейкая Узнагарода ўзлаванай хатняй гаспадыні.

Удзень мянты зрабілі рэйд на майстэрню Candy Factory, на якой актывісты рамантавалі ровары для пратэстаў, і сканфіскавалі каля 300 гатовых ровараў.

**16 сьнежня**

Яшчэ адна вялікая (як меркавалася) дэма з мэтай заблякаваць Бэлацэнтар, альбо, калі атрымаецца, уварвацца на ягоную тэрыторыю й правесьці "Народную асамблею" разам з прадстаўнікамі НДА (якія былі незадаволеныя, што іхны допуск у Бэлацэнтар быў фармальны - яны не маглі патрапіць ні на якую нараду, хаця афіцыйна былі назіральнікамі, тым больш на 16-е патрэбныя былі новыя прапускі, якія атрымалі 20-30% ад усіх НДА) і дэлегатамі ад паўднёваамэрыканскіх краін.

На Бэлацэнтар мусілі ісьці дзьве дэмы "сіняя" — легальная, па зацьверджаным маршруце, і "зялёная" — нелегальная, праз палі да задняга ўваходу. Плюс мусіў быць BikeBlock — раварысты, якія мусілі адцягваць увагу мянтоў, але ж ровары былі сканфіскаваныя ўчора, таму іх было мо' зь дзясятак.

"Зялёны блёк" быў заблякаваны на месцы збора, там было каля 200 чалавек, зь іх 60 былі затрыманыя. "Сінія" (каля 1000 чал.) дайшлі да пэрымэтру Бэлацэнтру, дзе мянты скарысталі дубінкі й газ, каб не пусьціць іх далей. З Бэлацэнтру выйшлі мо' якая сотня НДА-шнікаў і ўсяго толькі 2 прадстаўнікі балівійскай дэлегацыі. І яны таксама атрымалі дручка па карку. У самім Бэлацэнтры некалькі чалавек здолелі прабіць адмысловыя прапускі на паседжаньне, вырваліся на сцэну, пакрычалі на ёй хвілін зь 5 CJA-скія лёзунгі, а потым іх вывела ахова, і пазбавіла акрэдытацыі.

Карацей, ізноў поўны правал.

Увечары быў мітынг салідарнасьці з нашым затрыманым таварышам пад сьценамі яго турмы. Пастаялі там з паўгадзіны, пакрычалі лёзунгі й разыйшліся. Мянты атрымалі загад быць лагоднымі, нават калі ў іх кідалі сьнежкамі, то яны ўсьміхаліся, а потым сказалі вадзіле рэйсавага аўтобуса "вязі іх усіх бясплатна" :)

**17 сьнежня**

Ніякіх акцый, мы зьбіраемся дахаты. На вечаровым сходзе аб'явілі, што 17 чалавек дасюль знаходзяцца ў турме.

Спасылкі па тэме: nevertrustacop.org

# КАК ЭТО ПОНИМАТЬ?

**Взрыв комментариев белорусской сети вызвал снимок из Wall Street Journal, на котором участники белорусской делегации дрыхнут во время конференции в Копенгагене.**




**Грабеньков спал... Но через 20 минут он проснется! Это была выработанная годами на заседаниях БРСМ привычка.**

**Члены белорусской делегации в Копенгагене Сергей Завьялов и Александр Грабеньков в ответ рассказали, почему они спали на конференции.**

**«Условия работы напоминали бомжатник. Работали без душа, без нормальной еды, без всего. И как только появлялся какой-то перерыв, все сразу же засыпали» (Александр Грабеньков).**

**«Это фото из Wall Street Journal, и в этом издании четко написано про то, насколько была тяжелой ночная работа и ночные переговоры. И что только в перерывах между сессиями делегаты спали. Мне обидно за тех людей, которые просто порочат страну такими историями», - заметил представитель белорусской делегации.**

А вот версии пользователей сети.

- Спокойно, Буанасье! Ты опозорен не один - ты опозорен вместе с Францией.

- «Люди стоят, разговаривают». А пока люди стоят и разговарывают, бомжы поспать прылегли... :D))))))))))))

- Просто рабские условия труда...

- Интересно, почему это афроамериканец рядом сидит и не жалуется на плохие условия, а белорусский «делегат».

- Молодцы, так держать. В следующий раз берите с собой раскладушку и телогрейку. а то в пиджаке спать неподручно. Но галстук не забудьте. в него сморкаться удобно

- Бамжы бамжамі, але ў Беларусі калі працуюць на трох работах каб забяспечыць сям'ю ці пасля якоганебудзь прыходзяць дамоў то яны ж не жаляцца як там цяжка...

- Грабенькова вижу, а где Завьялов ? Под сталом?

- Если человеку плохо становится - он выходит (или его выносят - уж если совсем поплохеет). Это принято во всем мире на всех конференциях...

- Много ли жлобов в их регстаге в сравнении с нашим «бомондом»? * Как в том скандинавском бомжатнике проходят выборы, такие же они «чЭсныя и празрыстыя»? «Элеганты» ли у них победы? * Как живет их королева Маргрэта с семейством и какова ее охрана? * Как близко можно приближаться к ее резиденции и что за это будет?

* Нет ли там «линии Сталина» или еще чего-либо придуманного сказочником Г.Х.Андерсеном? И вообще, как там у них с историей многовековой, часто ли приходится переписывать? * Проводят ли регулярные политинформации на предприятиях, есть ли обязательная подписка на «СД - Дания сегодня», и вообще, какова государственная идеология в том бомжатнике? * Почему их бомжи любят свое бомжатское королевство?

* Есть ли у них датская «трасянка» и является ли она предметом национальной гордости для государственных мужей-бомжей? * Что бывает за вольности и «забывчатость» при заполнении деклараций для бомжей, избирающихся в их «национальную палатку» или на другие посты?

-.и пусть тебе присницдо хлобальное потепленье...оттока штобэ во сне несанкционированный выброс в атмосферу случайна не случилсо)))))

- Грабенькова вижу, а где Завьялов ? Под сталом? --Ды вот жэж он, радом сядит! Красивый загар, ево совсем и неузнать! :D И няспит, патамушта он накануне в солярыи отоспался... :D))))))))))))))))

- Сразу видно - Человек уработался... Не бережет себя... Упал прямо на рабочем месте... Так сладко говорили, что уснул!

- А второй где - по магазинам прошвырнуться полетел?..

- ...не бережешь ты себя, Юрий Венедиктович.

- Слабые люди спят лицом в салате, а сильные-лицом в десерте.

- РЕБЯТА! НА ЕГО МЕСТЕ ДОЛЖЕН БЫТЬ Я

- Негр удивляется, такого даже в Африке не видел

- Спят усталые игрушки......:) спят.....Кадры уже ничо не решают,

- Да что вы врете? Не спит он. Скупая мужская, алкогольная слеза ностальгии по хрустальному сасуду накатилась на лицо, в этом загнивающем, захолустном Копенгагене. Березки вспомнились, осинки.... Вобще утомили со своей экологией, ему еще подарки для родни нужно купить и джинсы для председателя первичной ячейки. Плачет и думает. А вы все спит, спит. Стыдно товарищи!

- А мне всё жа кажэцца, шо ето бяльгиец спит--Бяльгиец спиць, а негр з Бяларуссии сядзиць!

- Грыгор'явіч:Я бачу усе мудрыя тут сабраліся. Экалогія вам патрэбна. А як з пасяўной справіцца - камбайны сакрашчаць? А да фатаграфіі увогуле ня прэдрацца - усім бачна як беларус расчарнеўся ад злосьці, таго што бяльгіец спіць.

А что ещё там делать простому труженику? К распилу бабла за квоты на выбросы парниковых газов его уж точно не пригласят, так что можно и вздремнуть. Между тем, хорошо бы было узнать сколько, кому и на каких условиях продали.

- После шкварки и чарки......